■ Класныя навіны

# ВЫПУСКНЫ МАРАФОН

**Міністэрства адукацыі вызначылася з датамі правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, звязаных з заканчэннем навучальнага года і выпускнымі экзаменамі. Апошнія званкі для вучняў 9 і 11 класаў прагучаць сёлета 30 мая. А вучэбны год для ўсіх школьнікаў завяршаецца 31 мая. Выпускныя вечары для адзінаццацікласнікаў Міністэрства адукацыі рэкамендуе правесці 9-10 чэрвеня 2018 года.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

З 1 да 9 чэрвеня ў школах пройдуць выпускныя экзамены на II і III ступенях навучання.

Выпускнікі 11 класаў будуць здаваць чатыры абавязковыя экзамены. Пісьмовыя іспыты па рускай або беларускай мове (па выбары) і матэматыцы пройдуць 1, 4 і 6 чэрвеня 2018 года. Тэксты і заданні для правядзення выпускных экзаменаў у пісьмовай форме будуць аб'яўляцца праз сродкі масавай інфармацыі, а таксама размяшчацца на партале Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Навучэнцы сярэдніх школ, у якіх было арганізавана вывучэнне гэтых прадметаў на павышаным узроўні, будуць пісаць пераказ і экзаменацыйную работу па матэматыцы па розных заданнях і тэкстах. Акрамя таго, адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць экзамен па замежнай мове і гісторыі Беларусі.

Пасля заканчэння базавай школы вучні будуць здаваць тры экзамены: беларускую мову (дыктант), рускую мову (дыктант) і матэматыку (пісьмова). Даты правядзення пісьмовых экзаменаў — 2, 5 і 7 чэрвеня.

Ва ўстановах адукацыі, дзе навучанне і выхаванне вядзецца на польскай і літоўскай мовах, для навучэнцаў 9 і 11 класаў правядзяцца выпускныя экзамены ў пісьмовай форме па мове нацыянальнай меншасці: 24 мая — у 9 класах і 25 мая — у 11 класах.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пры правядзенні выпускных экзаменаў у пісьмовай форме (за выключэннем выпускнога іспыту па матэматыцы) у класах інтэграванага навучання і выхавання ствараюцца дзве экзаменацыйныя камісіі і выдзяляюцца два асобныя памяшканні для правядзення выпускных экзаменаў.

Праграмы ўступных іспытаў ва ўстановы адукацыі для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені і (або) сярэдняй спецыяльнай адукацыі на 2018 год можна знайсці на сайце Міністэрства адукацыі ў раздзеле «Агульная сярэдняя адукацыя» (падраздзел «Заканчэнне 2017/2018 навучальнага года»).

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

# ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ ВЫПУСКНІКОЎ І РАБОТАДАЎЦАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Найлепшыя «візітоўкі» будуць прадэманстраваныя на форуме падчас адкрытага паказу. Акрамя таго, рэзюмэ ўсіх удзельнікаў конкурсу ацэняць эксперты, што дазволіць студэнтам у далейшым выкарыстоўваць свае відэапрэзентацыі пры працаўладкаванні. Таксама ў рамках фіналу выступяць псіхолагі-практыкі і спецыялісты па аратарскім майстэрстве і невербальнай камунікацыі.

Удзельнікамі секцыі «Кампаніі» стануць прадстаўнікі БДУ і кіраўнікі арганізацый. Яны падзеляцца эфектыўным досведам узаемадзеяння ў вырашэнні пытанняў працаўладкавання маладых спецыялістаў. Працягнецца тэма на панэльнай дыскусіі, дзе будуць агучаны веды, навыкі і ўменні выпускніка, запатрабаваныя сучаснай эканомікай. Кампаніі прапануюць сваё бачанне таго, якіх спецыялістаў чакае рынак працы. Таксама патэнцыйным работадаўцам прэзентуюць «Электронную базу рэзюмэ выпускнікоў БДУ», дзе сабраны звесткі аб старшакурсніках усіх факультэтаў універсітэта.

Упершыню на форуме будзе арганізавана секцыя каардынатараў БДУ. Яна накіраваная на ўдасканаленне работы падраздзяленняў універсітэта па працаўладкаванні студэнтаў і ўзаемадзеянні з работадаўцамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «ПРАПУСЦІЦЬ ПРАЗ СЯБЕ»

**Анастасія ШВАЙБОВІЧ, афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях:**



— Самае першае, што кідаецца ў вочы, калі разгортваеш чарговы нумар газеты, — гэта яе тэматычная разнастайнасць. Шмат матэрыялаў друкуецца аб людзях, эканоміцы, жыцці ў рэгіёнах краіны, бяспецы жыццядзейнасці. Вельмі прыемна чытаць газету на беларускай мове. У кожным матэрыяле відавочна, што журналісты падыходзяць з душой да сваіх публікацый. Кожны тэкст яны прапускаюць праз сябе, займаюцца аналітыкай, а не проста выкладаюць пералік якіх-небудзь фактаў.

■ На парадку дня

# Няма акумулятара — няма апавяшчэння?

**На наступны дзень пасля трагедыі ў кемераўскім гандлёвым цэнтры «Зімовая вішня» Прэзідэнт даў даручэнне праверыць на прадмет бяспекі ўсе гандлёвыя цэнтры.**

Ратавальнікі ўзяліся за справу неадкладна. Рэйды, на якіх тэсціраваліся сістэмы пажаратушэння, адпрацоўваліся шляхі эвакуацыі, правяраліся веды і ўменні супрацоўнікаў, ішлі адзін за адным. І ўжо з'явіліся некаторыя вынікі работы.

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка** зазначыў праз двое сутак праверак, што некаторыя кіраўнікі грэбуюць пытаннямі бяспекі. Падчас рэйдаў выяўлялася адсутнасць сістэм апавяшчэння і аўтаматыкі, сістэмы пажаратушэння дзе-нідзе не працавалі.

— Напрыклад, у пятніцу ў Мінску ў адміністрацыйным будынку па адрасе Мельнікайтэ, 2 не працавала сістэма апавяшчэння, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Вольга МЕЛЬЧАНКА.** — Людзі аб умоўным пажары не даведаліся, і ніхто не здолеў эвакуявацца. Пры гэтым сістэма дымавыдалення спрацавала як мае быць — клапаны апусціліся і вентылятары ўключыліся. Па словах супрацоўнікаў, сістэма апавяшчэння была часова выключана з-за таго, што там мяняюцца акумулятары.

А вось у кінатэатры «Беларусь» вучэбная эвакуацыя прайшла на «выдатна». Невялікая замінка атрымалася ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» падчас праверкі каардынацыі дзеянняў аховы. Ва ўсім астатнім яго персанал дзейнічаў без памылак.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# «ДРЭВА КАЗАК» З АСАБЛІВЫМІ АКЦЁРАМІ

**2 красавіка, у Сусветны дзень інфармавання аб праблеме аўтызму, у Мінску на сцэне Рэспубліканскага палаца культуры ветэранаў адбудзецца прэм'ера спектакля «Дрэва казак», у якім нароўні з юнымі акцёрамі будуць іграць дзеці з аўтызмам. Спектакль пакажа ў Мінску сямейны інклюзіў-тэатр «І» пры падтрымцы аператара velcom.**



Гэты тэатр быў створаны ў 2016 годзе. Дактары, псіхолагі і спецыялісты сцвярджаюць, што людзі з аўтызмам з цяжкасцю могуць нават глядзець іншым людзям у вочы.

Многія з дзяцей, якія цяпер займаюцца ў інклюзіўным тэатры, да таго практычна не размаўлялі, баяліся моцных гукаў, і ўвесь іх свет абмяжоўваўся ўласнай кватэрай і бацькамі.

Пры дапамозе тэатра яны навучыліся камунікаваць з людзьмі, многія замест навучання дома сталі наведваць школу, самастойна хадзіць у краму, а, значыць, у будучыні яны маюць шанц стаць паўнавартаснымі членамі грамадства.

Акрамя іншага, аказалася, што яны насамрэч здольныя іграць на сцэне, прычым так, што гледачы не могуць адрозніць іх ад іншых акцёраў!

Урыўкі з новага спектакля інклюзіўны тэатр ужо паказаў на IV Міжнародным конкурсе «Скрыжаванне. Мінск», які прайшоў у беларускай сталіцы 16—18 сакавіка і сабраў удзельнікаў з Беларусі, Украіны, Літвы і іншых краін Еўропы. У выніку іх пастаноўка была прызнана найлепшым драматычным спектаклем конкурсу.

**Святлана БУСЬКО.**

## Дарэчы




**2 красавіка ў Мінску пройдзе акцыя «Таксі дабра» — 86 сініх аўтамабіляў таксі аператара 135 будуць бясплатна падвозіць усіх ахвотных. Акцыя ўваходзіць у серыю праектаў па прыцягненні ўвагі да праблемы аўтызму.**
**З 12.00 да 16.00 можна будзе бясплатна заказаць машыну службы 135 па кодавай фразе «Таксі дабра» альбо знайсці такую машыну ў горадзе, яна будзе дадаткова пазначаная адмысловымі наклейкамі. Вам трэба будзе толькі паказаць кіроўцу на сваім тэлефоне сімвал акцыі, які можна спампаваць у сацсетках, і можна ехаць бясплатна.**
**А некаторым пасажырам нават падораць бясплатныя білеты на прэм'еру спектакля «Дрэва казак» з удзелам юных акцёраў з аўтызмам.**

■ На слыху

# Мядзведзя ад вёскі адагналі. Ці далёка?..

**Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя паведаміла аб мерах, якія прымаюцца па сітуацыі са з'яўленнем дзікай жывёлы — мядзведзя ў вёсцы Пукшына.**

23 сакавіка прыблізна каля 23 гадзін у вёсцы Пукшына Віцебскага раёна мядзведзь траўмаваў мясцовага жыхара. Гэтая інфармацыя паступіла ў Віцебскую раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Неадкладна былі прыняты неабходныя меры па сітуацыі, якая склалася з удзелам дзікай жывёлы (мядзведзя).

Зараз мясцовымі выканаўчымі ўладамі сумесна з Віцебскай раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Віцебскім РАНС, Віцебскай структурай «Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў» з прыцягненнем спецтэхнікі праводзяцца мерапрыемствы, скіраваныя на адпужванне мядзведзя ад населенага пункта, у тым ліку метадам шумавога прагону. У выніку такіх мер мядзведзь адагнаны і знаходзіцца ад вёскі Пукшына на адлегласці 7-8 кіламетраў.

Мінпрыроды ўстанаўлівае падрабязныя абставіны здарэння для вызначэння далейшых дзеянняў у дачыненні да жывёлы.

Пры выяўленні захворвання гэтай дзікай жывёліны, небяспечнага для жыцця або здароўя грамадзян, неадкладна будзе прынята рашэнне аб яго выманні з асяроддзя пражывання. На такое выманне спецыяльны дазвол Мінпрыроды не спатрэбіцца.

У любым іншым выпадку, з улікам рэкамендацый НАН Беларусі і іншых зацікаўленых службаў, будуць прыняты далейшыя неабходныя меры па недапушчэнні знаходжання мядзведзя паблізу населенага пункта і забеспячэнні бяспекі грамадзян.

У выпадку паўторнага вяртання мядзведзя ў гэты населены пункт (набліжэння да вёскі) упаўнаважанымі службамі будуць прынятыя дзеянні па адбіцці нападу жывёла ўключна да яго вымання.

## Мінпрыроды інфармуе

Пры з'яўленні дзікай жывёлы ў населеным пункце і ў выпадку яе агрэсіўных паводзінаў, звязаных з пагрозай нападзення, грамадзяне (пры наяўнасці права на нашэнне і захоўванне зброі) альбо прадстаўнікі ўпаўнаважаных службаў маюць права распачаць адпаведныя дзеянні па адбіцці нападу жывёлы ўключна да яе вымання.

Звяртаем увагу, што ў названым выпадку неабходна ацаніць сітуацыю, прымаючы пад увагу біялагічныя асаблівасці дзікай жывёлы, а таксама пагрозу, звязаную з выкарыстаннем зброі ў населеным пункце (значная колькасць людзей), і па магчымасці не рабіць самастойных дзеянняў.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■